Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.
№ 65 (134)
СЕРАДА
20
САКАВІКА
1940 г.
Цана 10 капеек

Праз чатыры дні выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР

„Хто імкнецца да таго, каб наша радзіма была і надалей магутнай, культурнай і свабоднай соцыялістычнай дзяржавай, той будзе галасаваць за партыю большэвікоў, той будзе галасаваць за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.“

(Са звароту ЦК КП(б)Б)

Заходнія обласці Украіны і Беларусі перад выбарамі

Вялікія дні перажываюць зараз працоўныя заходніх абласцей Украіны і Беларусі: вызвалены народ з выключным уздымам рыхтуецца да выбараў сваіх дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР, УССР і БССР. Штодзённа праходзяць перадвыбарныя мітынгі і сходы—выбаршчыкі сустракаюцца са сваімі кандыдатамі, горача абмяркоўваюць іх жыццёвы шлях, іх работу ў мінулым і сучасным. Праз некалькі дзён—24 сакавіка — новыя грамадзяне нашай краіны пойдуць да выбарчых урнаў, аддадуць галасы за тых, хто зможа сваёй работай на карысць радзімы апраўдаць высокае званне выбранніка народа.

Хто яны, кандыдаты вызваленага народа? Сыны настач і лішэнняў, прайшоўшыя скрозь строй жорсткіх выпрабаванняў у былой панскай Польшчы, зведаўшыя ўсе жахі нечалавечага гнёту і бяспраўя, людзі, якія з першых-жа дзён самаахвотна дапамагалі Чырвонай Арміі вызваляць Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь ад панскай нечысці, а затым з энтузіязмам прыняліся за будаўніцтва новага жыцця, — вось каго народ вылучыў сваімі кандыдатамі.

Імёны гэтых людзей папулярны. Многія з іх у панскай Польшчы бясстрашна змагаліся супроць гнёту капіталістаў і памешчыкаў, узначальвалі рэволюцыйныя выступленні і забастоўкі, сядзелі ў турмах, падвяргаліся катаванням і збіенням, але не здаваліся, не схілялі галоў. Яны з надзеяй пазіралі на магутную совецкую краіну, якая ляжала па другі бок кардона, верылі, што дапамога прыдзе. І яна прыйшла! Многія з кандыдатаў паспелі ўжо праявіць сябе пасля прыходу Чырвонай Арміі як энергічныя грамадскія дзеячы, прымалі ўдзел у Народных Сабраннях Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, уваходзілі ў састаў Паўнамоцных Камісій, прыязджаўшых на V Унечарговую сесію Вярхоўнага Совета СССР, каб перадаць просьбу 13 мільёнаў нашых адзінакроўных братоў аб уключэнні іх у састаў Совецкага Саюза.

У Вярхоўны Совет СССР вылучана пяцьдзесят пяць кандыдатаў (на абодвух палатах). Гэта—людзі розных узростаў, розных нацыянальнасцей, розных прафесій. Усе яны ахоплены імкненнем аддаць сілы на тое, каб заходнія обласці Украіны і Беларусі як мага хутчэй дагналі ў сваім эканамічным і культурным развіцці астатнія краі і обласці СССР, дзе соцыялізм моцна ўвайшоў у быт і народ пажынае яго багатыя плады.

У памяці жыхароў заходніх абласцей УССР і БССР, якія зараз карыстаюцца ўсімі правамі, запісанымі ў Сталінскай Канстытуцыі, свежы ўспаміны аб тым, як праходзілі выбары ў ненавісны ім польскі сейм. Яны памятаюць, як паліцыя насільна зганяла выбаршчыкаў да ўрнаў. Народ байкатаваў выбары ў панскай Польшчы. Працоўныя не хацелі галасаваць за кандыдатаў буржуазіі. Пры апошніх выбарах у польскі сейм прымала ўдзел не больш 45 проц. выбаршчыкаў. З пачуццём ненавісці і агіды ўспамінаюць працоўныя Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі аб гэтых чорных днях.

Цяпер 6. крыніцай актыўнасць насельніцтва на перадвыбарных мітынгах і сходах. Людзі свабодна і непрымусова выражаюць свае пачуцці. Яны параўноўваюць сваё нядаўняе мінулае і сучаснае.

Прайшло паўгода з таго дня, калі Чырвоная Армія, выконваючы волю Совецкага ўрада, перайшла граніцу былой панскай Польшчы. Паўгода — тэрмін невялікі. Але як многа ўжо зроблена. як змянілася ўсё жыццё на землях Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі! Вызваліўшы нашых адзінакроўных братоў са згубнай вайны, зацяжной незадачлівай палі-скімі панамі, вызваліўшы народ ад гнёту капіталістаў і памешчыкаў, Совецкая ўлада дала ў яго рукі ўсё неабходнае для ўстройства свайго жыцця на новых асновах. Працоўныя заходніх абласцей УССР і БССР могуць цяпер жыць і працаваць гэтак-жа, як жывуць і працуюць усе грамадзяне СССР. Совецкая ўлада дала сялянам зямлю, якая раней належала памешчыкам, буйным чыноўнікам і манастырам, нацыяналізавала фабрыкі, заводы, банкі, перасяліла рабочых з падвалаў у палацы багацеяў, адкрыла сотні новых школ, дзе дзеці украінцаў і беларусаў могуць займацца на сваёй роднай мове. За паўгода, мінуўшыя з моманту прыходу Чырвонай Арміі, поўнасцю ліквідавана беспрацоўе — гэты страшны біч, пад пагрозай якога заўсёды знаходзіліся працоўныя былой Польшчы, як знаходзяцца цяпер працоўныя іншых капіталістычных краін. Прадпрыемствы, разбураныя ў час вайны, цяпер адноўлены, лік рабочых на іх значна павялічан.

Сяляне з вялікім энтузіязмам рыхтуюцца да сустрэчы першай совецкай вясны. На палях ужо ў гэтым годзе будуць працаваць трактары і іншыя машыны.

З шырокіх народных мас падняліся да актыўнай палітычнай, гаспадарчай і культурнай дзейнасці тысячы людзей, якія ў былой Польшчы былі бяспраўнымі. Зараз гэтыя людзі з поспехам працуюць у дзяржаўных органах, кіруюць прадпрыемствамі, культурнымі установамі, самі арганізуюць сваё жыццё.

У ходзе выбарчай кампаніі мільёны новых совецкіх грамадзян праходзяць вялікую палітычную школу, упэўнена далучаюцца да актыўнага ўдзелу ў дзяржаўным жыцці.

Нельга, аднак, не адзначыць, што сям-там агітатары не ўлічваюць спецыфічнай абстаноўкі ў заходніх абласцях, забываюць часам, што ім прыходзіцца працаваць сярод насельніцтва, якое толькі паўгода таму назад жыло ў капіталістычным грамадстве. Тут асабліва неабходны дыферэнцыраваны падыход, дэталёвае і папулярнае раз'ясненне людзям усіх няясных пытанняў. Не трэба апасацца паўтараць слухачам здаючыяся нам элементарнымі ісціны, бо тое, што для нас стала ўжо даўным-даўно прывычным, для жыхароў заходніх абласцей з'яўляецца яшчэ нярэдка адкрыццём.

Значэнне масавай агітацыі ў заходніх абласцях Украіны і Беларусі асабліва вялікае яшчэ і таму, што ахвосце разгромленых паноў, контррэволюцыйныя буржуазна-нацыяналістычныя элементы прабуюць перашкодзіць паспяховаму ходу выбараў. Працоўныя пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый выкрываюць варожыя махінацыі, прасякаюць іх падрыўную работу. Большэвікі заходніх абласцей УССР і БССР павінны ўсяляк развіваць у народзе рэволюцыйную пільнасць, трымаць яго ў пастаяннай гатоўнасці даць моцны адпор проіскам ворага.

Жыхары заходніх абласцей УССР і БССР сустракаюць дзень выбараў велізарным палітычным і вытворчым уздымам. На заводах і фабрыках шырыцца соцыялістычнае спаборніцтва. Ёсць ужо і стаханаўцы. У гэтых фактах відаць пачатак зараджаючыхся ў сазнанні людзей соцыялістычных адносін да працы. Партыйныя і комсамольскія арганізацыі заходніх абласцей павінны ўсяляк падтрымаць гэты рух і шырока папулярызаваць яго.

24 сакавіка мільёны новых совецкіх грамадзян дружна і арганізавана прыйдуць да выбарчых урнаў. Падаючы галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, яны будуць галасаваць за сваю светлую будучыню, за радаснае, шчаслівае і вольнае жыццё.

(Скарочаны перадавы артыкул «Правды» ад 17 сакавіка).



СЦЕФАНІДА ІВАНАЎНА КРАСНІЦКАЯ,
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 358



ПЕТР АНДРЭЕВІЧ ГЛАДКОЎ,
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 332.

Працоўныя Беластока вітаюць зварот ЦК КП(б)Б да выбаршчыкаў

З вялікім уздымам праходзяць на прадпрыемствах Беластока мітынгі і сходы рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў, прысвечаныя звароту ЦК КП(б)Б да выбаршчыкаў.

На мітынгу тэкстыльшчыкаў 4-га камбіната прысутнічала каля 300 чалавек. Яны з вялікай увагай праслухалі гэты гістарычны дакумент. Ткач Вайнбух у сваім выступленні заявіў:

— Совецкая ўлада за некалькі месяцаў свайго існавання ліквідавала ў асноўным беспрацоўе, чаго ніколі не змогуць дабіцца капіталістычныя краіны. Совецкая ўлада дала нам мір і моцна ахоўвае наш спакой. Гэтага не можа даць буржуазны свет. Цяжкасці, якія мы яшчэ наглядаем, — гэта, безумоўна, часовая з'ява і яны будуць перамажаны. Я заклікаю ўсіх выбаршчыкаў аддаць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Галасуючы за іх, мы будзем галасаваць за нашу шчаслівую будучыню.

З гарачымі прамовамі выступалі таксама тт. Сенкевіч і Фершт. У аднадушным рашэнні мітынга запісана:

«Мы, рабочыя і служачыя 4-га камбіната, горача адабраем і вітаем зварот ЦК КП(б)Б да выбаршчыкаў з заклікам аддаваць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Мы з радасцю аддадзім свае галасы за лепшых сыноў і дачок народа, дастойных прадстаўнікоў непераможнага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Галасуючы за іх, мы будзем галасаваць за новыя поспехі соцыялістычнага будаўніцтва ў заходніх абласцях Беларусі, за шчаслівае, радаснае жыццё».

* * *

Такія-ж сходы праходзілі ўчора на 3-м тэкстыльным камбінаце, чыгуначным вузле гор. Беластока і іншых прадпрыемствах. На многіх прадпрыемствах бясседчыкі чытаюць зварот ЦК КП(б)Б у часы абедзенных перапынкаў. Усе працоўныя імкнуцца азнаёміцца з гэтым гістарычным дакументам.

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР Міхаіла Пракоф'евіча Кавалёва са сваімі выбаршчыкамі

К 5 гадзінам гарадскі тэатр запоўнілі выбаршчыкі. Звыш 1.000 чалавек прыйшлі на сустрэчу са сваім кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР, тройчы ордэнаносцам, камандуючым войскамі Беларускай Асобай Ваеннай Акругі Міхаілам Пракоф'евічам Кавалёвым.

Сход адкрыў старшыня акруговай выбарчай камісіі тав. Новікаў. У прэзідыум сход выбраў сакратара абкома тав. Ігаева, тав. Кавалёва, тав. Спасава, старшыню аблвыканкома тав. Мальцава, т.т. Чэрнікава, Тупіцына, Прохарава, Гладкова, Дуброўскага і іншых — усяго 19 чалавек.

Бурнымі апладысментамі сустрэлі выбаршчыкі прапанову работніцы шклозавода тав. Пятрук аб выбранні пачотнага прэзідыума. Пад незмаўкаючыя апладысменты і прывітальныя воклічы ў пачотны прэзідыум выбіраюцца таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Калінін, Андрэеў, Жданаў, Мікаян, Хрушчоў, Швернік, Берыя, Дзімітраў, Тэльман.

Слова прадастаўляецца кандыдату ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тав. Кавалёву.

Прамова тав. М. П. Кавалёва

Таварышы, рабочыя і работніцы! Таварышы працоўныя Беластока!

Ад імені байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Беларускай Асобай Ваеннай Акругі перадаю Вам гарачае чырвонаармейскае прывітанне.

Не так даўно ўрад Саюза ССР заключыў мірны дагавор з Фінляндыяй, даказаўшы гэтым усяму свету сваё імкненне жыць у міры з усімі народамі. **(Апладысменты).**

На працягу многіх год Фінляндыю падрыхтоўвалі ў якасці плацдарма для вайны супроць Совецкага Саюза. Там рыхтавалася пагроза супроць слаўнага горада Леніна. Падбухтораваемая падпальшчыкамі вайны, Фінляндыя адвергла справядлівыя і дружалюбныя прапановы Совецкага ўрада і распачала правакацыйныя напады. Урад СССР прыняў адпаведныя меры. На палях Фінляндыі ўсяму свету яшчэ раз была паказана магутнасць совецкага народа, магутнасць нашай тэхнікі, магутнасць нашай непераможнай Чырвонай Арміі. **(Бурныя апладысменты).**

Совецкі ўрад няўхільна праводзіць палітыку міру, палітыку дружбы з усімі вялікімі і малымі народамі. Як толькі Фінляндыя задаволіла нашы справядлівыя патрабаванні, Совецкі ўрад згадзіўся заключыць мірны дагавор.

Зараз на палях Фінляндыі, дзе раней каваліся пагрозы нападу на СССР, створан фарпост, які закрывае доступ свіному рылу ў наш совецкі агарод. **(Апладысменты).** Калі хто-небудзь паспрабуе ступіць на нашу свяшчэнную зямлю хоць адной нагой, той страціць не толькі абедзве ногі, але і галаву. **(Апладысменты).**

Па распараджэнню Совецкага ўрада Чырвоная Армія ўзяла пад сваю абарону прыгнечаных працоўных Заходняй Беларусі і Украіны, вызваліла 13 мільёнаў працоўных. Мы сталі на варце і знаходзімся заўсёды ў стане баявой гатоўнасці.

Вы, не гледзячы на сваю маладосць,—прайшло толькі шэсць месяцаў, калі вы сталі совецкімі грамадзянамі, — разам з усім совецкім народам уключыліся ў творчую работу. Таму вам патрэбна прыкласці намаганні, каб мець права, падводзячы вынікі прароблены работы, сказаць: мы ідзём у ногу з усім совецкім народам і ніздзе не адстаём.

Я прыношу выбаршчыкам вялікую ўдзячнасць за аказаную мне чэсць і заяўляю, што ўсе свае веды скарыстаю для справы абароны нашай вялікай радзімы. Да апошняй кроплі крыві аддам сваё жыццё за наш вялікі народ.

Апошнія словы тав. Кавалёва былі пакрыты бурай апладысментаў.

Пачаліся выступленні. Рабочы шклозавода тав. Лапат у сваёй прамове гаварыў:

— Праз некалькі дзён мы пойдзем на выбарчыя ўчасткі, каб аддаць свае галасы за лепшых сыноў і дачок народа. Вязнямі ў панскай турмы народаў, мы будзем вечна ўдзячны слаўнай Чырвонай Арміі за сваё вызваленне. Прадстаўнікі Чырвонай Арміі і ў асаблівасці камандуючы войскамі Беларускай Асобай Ваеннай Акругі тав. Кавалёў будуць нашымі жаданымі дэпутатамі. Я заклікаю ўсіх выбаршчыкаў арганізавана з'явіцца на выбары 24 сакавіка і аддаць свае галасы за нашых верных кандыдатаў.

З гарачай прамовай выступіла тэкстыльшчыца першага камбіната тав. Барташук.

— Першы раз у жыцці, — гаворыць яна, — я выступаю на сходзе. Выступаю для таго, каб заявіць, што дзень 24 сакавіка будзе для нас днём вялікага свята. Наш камбінат абавязаўся да 24 сакавіка выканаць квартальны вытворчы план. Гэта абавязацельства мы выканалі датэрмінова. Увесь рабочы калектыў вядзе барацьбу за дастойную сустрэчу дня выбараў. Гэта нашы выбары —мы будзем выбіраць **сваіх** прадстаўнікоў. Я заклікаю выбаршчыкаў галасаваць за таварыша Кавалёва.

Вялікім пачуццём было прасякнута выступленне кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тав. М. Дз'ячук. З прамовай выступілі таксама тав. Ухараў, які расказаў аб чуласці і ўздзячлівасці таварыша Кавалёва ў любой абстаноўцы.

Пад бурныя апладысменты і прывітальныя воклічы была прынята прывітальная тэлеграма правадыру народаў вялікаму Сталіну.

— 24 сакавіка, — гаворыць у прывітанні, — мы ўсе, як адзін, з'явімся на выбарчыя ўчасткі, каб аддаць свае галасы за лепшых сыноў і дачок народа, кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

І. Каральков.

УЗОРНА ПРАВЯДЗЕМ ПЕРШУЮ СОВЕЦКУЮ ВЯСНУ

ЛЕПШ АРГАНІЗАВАЦЬ АЧЫСТКУ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ

Надыходзяць цёплыя дні. Хутка растае снег. На палях з кожным днём паяўляецца ўсё больш і больш праталін. Неўзабаве пачнуцца вясеннія палявыя работы. Сяляне Ломжынскага раёна, як і ўсіх раёнаў нашай вобласці, упершыню будуць праводзіць вясеннюю сяўбу на ўласных землях, якія дала ім совецкая улада.

Прыклад у падрыхтоўцы да вясны паказвае Пятніцкі сельсовет, дзе старшынёй працуе тав. Віленчык. Для хутчэйшай падрыхтоўкі насеннага матэрыялу да сяўбы, сельсовет уключыў у работу ўсе 30 вязлак сялянскіх гаспадарак. У кожным населеным пункце сельсоветам вылучан актывіст-селянін або член сельсовета, які адказвае за арганізацыю ачысткі насення, за бесперабойную работу кузняў і забеспячэнне іх вугалем. Гэтыя таварышы, спаборнічаючы паміж сабой, праводзяць вялікую масавую работу сярод сялян, штодзённа растлумачваючы ім вялікае значэнне своечасовай падрыхтоўкі да сяўбы. У выніку сельсовет праз два-тры дні поўнасцю закончыць ачыстку насення і рамонт інвентару.

Але, на жаль, у астатніх сельсоветах раёна з падрыхтоўкай да вясенняй сяўбы справа абстаіць значна горш. У Мясніцкім сельскім совеце да гэтага часу ачысцілі насенне толькі ў былых маёнтках, зараз належачых нядаўна арганізаванай сельгасарцелі. Для сялянскіх аднаасобных гаспадарак амаль нічога не зроблена.

Такі-ж малюнак і ў іншых сельсоветах на зернаачышчальных пунктах.

Да пачатку вясенняй сяўбы астаюцца лічаныя дні. Увесь насенны матэрыял павінен быць хутка і поўнасцю ачышчан.

Л. Федасенка.

Дзейная падрыхтоўка да сяўбы

Сяляне Парэцкага раёна дзейна рыхтуюцца да сустрэчы першай большэвіцкай вясны. Усюды праводзіцца ачыстка насення, рамантуецца сельска гаспадарчы інвентар. Многія сяляне пачалі праверку якасці насення ў кантрольна-насенных лабараторыях.

Сялянству аказваецца вялікая дапамога па падрыхтоўцы да вясенняй сяўбы. У раёне створана 8 зернаачышчальных пунктаў. Для вывучэння агратэхнікі ў раённым цэнтры створаны спецыяльныя курсы, дзе займаецца 40 сялян.

Добра разгортваецца падрыхтоўка да вясны ў Ліхачоўскім сельсовеце, дзе старшынёй тав. Пудлоўскі. Тут ужо закончан абмалот і ачыстка насення. Многія сяляне прыступілі да вывазкі ўгнаення на палі і заканчваюць абмен насення на гатунковае.

У раёне арганізуецца першая машынна - трактарная станцыя. Яна дапаможа сялянам узорна правесці першую совецкую вясну. На палях Парэцкага раёна будзе працаваць 10 трактараў. Вестку аб арганізацыі машынна - трактарнай станцыі сяляне сустрэлі з вялікім задавальненнем.

Батракі, беднякі і серадлякі праяўляюць вялікі інтарэс да калгаснага будаўніцтва. Яны вывучаюць статут сельскагаспадарчай арцелі. У радзе вёсак перадавыя сяляне —батракі, беднякі і серадлякі — падаюць заявы аб уступленні ў калгас.

У вёсках Хамуты, Дзершты і Падбершты звыш 100 сялян падалі свае заявы аб уступленні ў калгас. Тут ужо створаны ініцыятыўныя групы па арганізацыі калгасаў.


В. Гродненскі

СПАБОРНІЦТВА КАЛГАСАЎ

У калгасе імені Варашылава (вёска Азяблы, Заблудаўскага раёна) адбыўся агульны сход. На сходзе прысутнічала таксама многа калгаснікаў і працоўных сялян з вёскі Пенькі. Старшыня калгаса т. Гутнік расказаў, як калгас рыхтуецца да першай большэвіцкай вясны.

З вялікім адабрэннем калгасны сход падтрымаў ініцыятыву калгаснікаў калгаса імені Сталіна аб разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва за высокі ўраджай. У сваім рашэнні калгаснікі запісалі: „Мы, калгаснікі калгаса імені Варашылава, аднадушна падтрымліваем ініцыятыву калгаснікаў калгаса імені Сталіна. Выклік на соцыялістычнае спаборніцтва прымаем. Бярэм на сябе абавязацельства працаваць так, каб першынства ў спаборніцтве было за нашым калгасам“.

Тут-жа на сходзе быў падпісан соцыялістычны дагавор паміж калгасамі.



Гутаркі з выбаршчыкамі

ШТО ТАКОЕ УСЕАГУЛЬНЫЯ ВЫБАРЫ?

У Сталінскай Канстытуцыі і ў канстытуцыях Украінскай, Беларускай і другіх саюзных рэспублік, у «Палажэннях аб выбарах» дакладна ўказана, што права ўдзельнічаць у выбарах і быць выбранымі у Советы дэпутатаў працоўных у нашай краіне маюць усе грамадзяне — мужчыны і жанчыны, — дасягнуўшыя да дня выбараў 18 год, без розніцы, да якой расы ці нацыянальнасці яны належаць, якую веру прызнаюць, якую маюць адукацыю, колькі часу жывуць у данай мясцовасці, якое іх соцыяльнае паходжанне і маёмаснае становішча, чым яны займаліся ў мінулым. Не могуць выбіраць і быць выбранымі ў Советы толькі асобы, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку пазбаўленымі розуму, а таксама асуджаныя судом з пазбаўленнем выбарчых правоў.

Толькі ў нас пры соцыялістычнай дэмакратыі існуюць сапраўды ўсеагульныя выбары органаў дзяржаўнай улады. Увесь совецкі народ, карыстаючыся прадастаўленымі па Канстытуцыі СССР правамі, можа беспераշкодна прымаць удзел у выбарах органаў улады. Гэта бліскуча пацвердзілі выбары ў Вярхоўны Совет СССР і Вярхоўныя Советы саюзных і аўтаномных рэспублік, у якіх прыняла ўдзел 96—99 процантаў выбаршчыкаў — усё дарослае насельніцтва краіны.

Ці можна гэта параўнаць з тым, што было ў Польшчы пры выбарах у сейм?

Насельніцтва Польшчы заўсёды байкатыравала выбары ў сейм, аснованыя на прымусу і фальсіфікацыі. Нават па звестках, апублікаваных самім польскім урадам, у выбарах у сейм 1935 года ўдзельнічала толькі 46 процантаў выбаршчыкаў, па самай-жа справе выбірала яшчэ менш — 27—30 процантаў!

У Совецкім Саюзе ў вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і ў мясцовыя Советы выбраны перадавыя людзі краіны — прадстаўнікі ўсіх пластоў насельніцтва: рабочыя і сяляне-калгаснікі, інтэлігенты, ваенныя, навучаючыяся, — дарослыя, старыкі і моладзь, — жанчыны і мужчыны.

Канстытуцыі многіх буржуазных краін, у тым ліку і канстытуцыя былой Польшчы, на словах агалашалі ўсеагульныя выбары. Але па справе ўсеагульнага выбарчага права ў краінах капітала не існуе.

У большасці капіталістычных краін грамадзяне не маюць выбарчых правоў ці пад прадлогам няведання дзяржаўнай мовы, ці таму, што непастаянна жывуць у данай мясцовасці.

У многіх краінах пазбаўлены выбарчых правоў жанчыны, ваеннаслужачыя, моладзь да 20—21 года, а, напрыклад, у Польшчы, па канстытуцыі 1935 года, выбіраць маглі толькі асобы, дасягнуўшыя 24-гадовага ўзроста.

Як бачым, сапраўды ўсеагульных выбараў у краінах капітала не існуе. Толькі ў СССР усеагульнае выбарчае права, агалашонае Сталінскай Канстытуцыяй, не мае ніякіх абмежаванняў.

ШТО ТАКОЕ РОЎНЫЯ ВЫБАРЫ?

Роўнае выбарчае права азначае, што кожны выбаршчык мае роўны з усімі выбаршчыкамі голас.

Пры выбарах у Советы дэпутатаў працоўных ніхто з грамадзян СССР не карыстаецца якімі-небудзь перавагамі. Рабочы мае тыя-ж правы, што і селянін, жанчыны—тыя-ж правы, што і мужчыны, ваеннаслужачыя выбіраюць і могуць быць выбранымі нароўні з другімі грамадзянамі.

У краіне Советаў кожны грамадзянін мае на выбарах толькі адзін голас. Пагэтаму кожны выбаршчык у нас заносіцца ў адзін выбарчы спісак і ў дзень выбараў галасуе толькі ў адным выбарчым участку. Такі парадак устаноўлен Канстытуцыяй СССР і «Палажэннем аб выбарах».

Па совецкай выбарчай сістэме ўсе акругі па выбарах у Совет Саюза роўны. Пры выбарах у Совет Саюза ад кожных 300 тысяч насельніцтва выбіраецца адзін дэпутат. Ні адна з акруг не можа паслаць больш аднаго дэпутата.

Поўная роўнасць выбарчых акруг забяспечана і пры выбарах у Вярхоўныя Советы Украінскай, Беларускай і іншых рэспублік.

Сапраўднай роўнасці на выбарах у буржуазна-дэмакратычных краінах не існуе, бо там памешчыкі і капіталісты, стоячыя ва ўладзе, усімі сродкамі ўрэзваюць правы працоўных мас. Пагэтаму буржуазныя выбарчыя законы прадугледжваюць усякія прывілеі пры выбарах для маёмных класаў. У Англіі, напрыклад, адзін і той-жа грамадзянін, уладаючы зямлёй у розных графствах, мае права голаса ў некалькіх выбарчых акругах.

Польская канстытуцыя, як і другія буржуазныя канстытуцыі, таксама агалашала роўныя выбарчыя правы. Але якая магла быць роўнасць выбарчых правоў у былой Польшчы. Украінскаму або беларускаму селяніну не толькі нельга было ўвайсці дэпутатам у сейм, іх не дапускалі нават да пасады солтыса, або падсолтыса, бо па распараджэнню міністра ўнутраных спраў на гэтыя пасады выбіраліся толькі ўмеючыя гаварыць і пісаць па-польску. У нас-жа, у Советы выбіраюць людзей незалежна ад таго, на якой мове яны гавораць.

ШТО ТАКОЕ ПРАМЫЯ ВЫБАРЫ?

Прамое выбарчае права азначае, што кожны выбаршчык галасуе на выбарах непасрэдна (прама), а не праз прадстаўнікоў ці ўпаўнаважаных, выбраных на выбарчых сходах. Прамое галасаванне — непасрэдна за высунутых кандыдатаў — праводзіліся ў нас на выбарах у Народнае Сабранне пасля вызвалення заходніх абласцей Украіны і Беларусі ад іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Па Сталінскай Канстытуцыі, кожны выбаршчык непасрэдна сам галасуе за кандыдата ва ўсе Советы дэпутатаў, пачынаючы ад Вярхоўнага Совета СССР і канчаючы гарадскім ці сельскім. Гэтым устанаўліваецца вялікая адказнасць дэпутата перад выбаршчыкамі і больш моцная сувязь яго з масай выбаршчыкаў.

Глава совецкага ўрада тав. В. М. Молатаў гаворыць, што «прамыя выбары паднімуць яшчэ вышэй аўтарытэт органаў совецкай улады і яшчэ больш узмоцняць сувязь гэтых органаў з шырокімі масамі працоўных. Рабочыя і сяляне будуць лепш ведаць сваіх прадстаўнікоў не толькі ў раёне і вобласці, але і ў цэнтральных органах совецкай дзяржавы, будуць з імі яшчэ непасрэдна звязаны, і тым самым, уся работа кіруючых органаў совецкай улады павінна ўзняцца на больш высокую ступень».

Прамыя выбары маюць вельмі вялікае значэнне таму, што совецкі дэпутат, які вышаў з народа, трымае пастаянную сувязь з народам, з сваімі выбаршчыкамі.

«У капіталістычных краінах, — гаворыць таварыш Сталін, — «пакуль ідуць выбары, дэпутаты заігрываюць з выбаршчыкамі, лебязяць,

24 САКАВІКА — УСЕ НА ВЫБАРЫ!



На здымку: Францц Іванавіч Мачульскі, кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 341.

Участак гатоў да сустрэчы выбаршчыкаў

Па Чырвонаармейскай вуліцы, у напрамку Дайлідаў, здалёк відаць упрыгожаны будынак. На фасадзе плакаты аб падзеях у дні вызвалення ўкраінскага і беларускага народаў, партрэты членаў Палітбюро ЦК ВКП(б), напісаныя маслянымі фарбамі, лозунгі. Уночы-ж ярказзяе чырвоная зорка з лічбаю 24.

Памяшканне выбарчага ўчастка рэзка адрозніваецца ад многіх іншых сваім убраннем. Кабіны выглядзяць таксама прыгожа. Шоўкавыя шторы, спускаючыся мяккімі складкамі, закрываюць уваход у іх. Над дзвярамі прымацаваны гербы СССР. Паміж уваходамі ў кабіны стаяць на тумбачках вазоны з жывымі кветкамі. На ўзвышку стаіць урна для бюлетэняў.

Сцены ўпрыгожаны вітрынамі. Паказан шлях гераічнай Чырвонай Арміі. Канстытуцыя СССР змешчана на прыгожа змантыраванай вітрыне, акаймаваной сцягамі 11 савецкіх рэспублік. Вітрына аб гісторыі ВКП(б). На самым відным месцы - газета, у якой змешчаны біяграфіі і партрэты кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР таварышоў Кавалёва і Турлейскага і ў Вярхоўны Совет БССР тав. Іванова.

Усё зроблена акуратна і прыгожа. І само памяшканне настолькі ўтульнае, што не хочацца выхадзіць. Таму на ўчастку заўсёды многалюдна, ажыўлена.

Прыемнае ўражанне астаецца ад наведвання такога ўчастка. Старшыня ўчастковай выбарчай камісіі тав. Коўпій з членамі камісіі і агітатарамі тав. Кісялёвым, Шапавалавым, Жолтышавым і іншымі выконваюць свае абавязкі добрасумленна.

Н. Бражнікава.

НА ВЫБАРЧЫМ УЧАСТКУ № 32

Па Жаўткоўскаму шасе г. Беластока прыцягвае ўвагу велізарнае пано будучага Палаца Советаў. З левага боку на чырвоным палатне вялікімі літарамі выпісан артыкул з Сталінскай Канстытуцыі, побач — рад лозунгаў, плакатаў; уверсе—герб краіны сацыялізма, а вышэй — партрэт правадыра ўсіх працоўных таварыша Сталіна. Усярэдзіне на кумачовым палотнішчы лозунг: „Аддадзім свае галасы непераможнаму сталінскаму блоку комуністаў і беспартыйных". Гэта знадворны выгляд выбарчага ўчастка № 32, які змяшчаецца ў чыгуначным клубе.

Кіпіць жыццё ў памяшканні ўчастка. За час падрыхтоўкі да выбараў ён стаў цэнтрам культурна-масавай і палітвыхаваўчай работы. Сюды штодзённа прыходзяць дзесяткі выбаршчыкаў, каб паслухаць цікавую гутарку і падзяліцца сваімі думкамі і радасцю аб шчаслівым жыцці. Для выбаршчыкаў тут часта наладжваецца кіно, дэманструецца мастацкая самадзейнасць клуба, даюцца канцэрты.

На ўчастку выпушчаецца насценная газета "Голас выбаршчыка", якая паказвае вопыт агітацыі за кандыдатаў, ускрывае недахопы, мабілізуе выбаршчыкаў на дастойную сустрэчу выбараў. 18-гадовая выбаршчыца тав. Прэнская ў газеце піша: „Я горда тым, што толькі ў нашай краіне Советаў дадзена права моладзі выбіраць і быць выбранымі ў вышэйшыя органы дзяржаўнай улады. Да дня выбараў я рыхтуюся, як да самага вялікага свята. Я шчаслівa, і ў гэты гістарычны дзень, 24 сакавіка, з радасцю прагаласую за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных т. т. Вайцэшука, Кавалёва і Турлейскага.

У памяшканні ўчастка ёсць радыёпрыёмнік, многа газет, журналаў, палітычнай і выбарчай літаратуры. Працуе стол даведак, дзяжурныя растлумачваюць розныя пытанні, даюць парады выбаршчыкам. У апошнія дні выбаршчыкі больш цікавяцца тэхнікай галасавання. А вось гэта на ўчастку і не ўлічылі.

Калі члены камісіі тлумачаць наведвальніку, куды павінен зайсці выбаршчык у час галасавання, то яны паказваюць на сцяну, у якой яшчэ будуць праўрублены дзверы. Пяць кабін, праўда, ужо абсталяваны, але занавесак няма, столікаў таксама няма. Выбарчыя ўрны не пафарбаваны.

Чатыры дні асталося да дня выбараў. На ўчастках ужо сёння павінна ўсё быць гатова да гасціннай сустрэчы выбаршчыкаў.

Г. Лупсякоў.

АГІТАЦЫЯ ЗА КАНДЫДАТАЎ

Звыш 250 агітатараў, давераных асоб, чытчыкаў і бяседчыкаў на ўсіх 23 выбарчых участках Парэцкага раёна праводзяць агітацыю за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Яны знаёмяць выбаршчыкаў з біяграфіямі, жыццём і дзейнасцю кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тт. Прытыцкага і Пестрака, кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Суравец.

У радзе вёсак арганізаваны самадзейныя калектывы, у якіх актыўны ўдзел прымае моладзь. Гэтыя калектывы са сваімі пастаноўкамі паспяхова выступаюць перад выбаршчыкамі.

З вялікім уздымам у раёне праходзяць сустрэчы кандыдатаў з выбаршчыкамі. Больш 500 выбаршчыкаў з сёл і вёсак прышлі на сустрэчу са сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР Філіпам Сямёнавічам Пестраком.

У сваіх шматлікіх выступленнях выбаршчыкі заявілі, што яны ў дзень выбараў усе, як адзін, з'явяцца на выбарчыя ўчасткі і аддадуць свае галасы за лепшых сыноў радзімы, за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

В. Гарбанёў.

БЛЫТАНІНА Ў СПІСКАХ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Заблудава. (Па тэлефону). Спіскі выбаршчыкаў — гэта важнейшы выбарчы дакумент, да састаўлення якога патрэбна падыйсці з усёй сур'ёзнасцю. Аднак не так зрабілі ў гарадскім пасёлку Заблудаве.

Пасялковы выканаўчы камітэт даручыў састаўленне спіскаў малапісьменным. Яны па два разы запісвалі аднаго і таго-ж выбаршчыка, не ўносілі ў спіскі асоб 1922 года нараджэння, якім да дня выбараў споўніцца 18 год, пераблыталі годы нараджэння, прозвішчы і т. д.

Толькі за апошнія тры дні было ўнесена ў спіскі 300 прапушчаных выбаршчыкаў. Выбаршчыкаў Ляненкаву і Гладштэйн занеслі ў спіскі два разы. Некаторым грамадзянам прыпісаны такія годы нараджэння, як 1090, 1960 і... 102.

Іншыя вынікі на ўчастку № 1 і не маглі атрымацца. Тут фактычна няма старшыні выбарчай камісіі. Раней быў Кір'янаў, зараз райвыканкам вылучыў тав. Рохліна, які ні разу не быў на ўчастку. І не дзіўна, што сакратар участковай выбарчай камісіі тав. Шаўрова не змагла назваць прозвішча старшыні камісіі.

Прыходзяць выбаршчыкі са скаргамі, а на ўчастку няма дзяжурных. Выпраўленне спіскаў робяць усе, каму не лень. Заявы выбаршчыкаў ляжаць не разгледжанымі па 20 дзён.

Старшыня пасялковага выканкома тав. Перэльгут не прымае мер да хутчэйшага выпраўлення спіскаў выбаршчыкаў. Не цікавіцца такім становішчам і старшыня райвыканкома тав. Крупадзёраў.

Да дня выбараў асталіся лічаныя дні. Неабходна мабілізаваць увесь выбарчы актыў на ўдакладненне і выпраўленне спіскаў выбаршчыкаў з тым, каб не аказаўся прапушчаным ні адзін выбаршчык.

М. Шахновіч.



На здымку: члены выбарчага ўчастка № 76 у Беластоку рыхтуюць чарговы нумар насценгазеты.

(Фота-хроніка БЕЛТА).

Адчуваецца блізасць вялікага свята

Участак займае два вялікіх пакоі. Памяшканне ўпрыгожана партрэтамі правадыроў, лозунгамі. На стале — літаратура і газеты на розных мовах. Мяккі дыван, вялікае люстра, кветкі, фіранкі на вокнах ствараюць утульную абстаноўку. Налева ад уваходу вісіць насценгазета „Голас агітатара", побач —біяграфіі кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР тт. Кавалёва, Машэвіцкага і Турлейскага. У другім пакоі падрыхтаваны перагародкі для кабін.

На ўчастку многа народу. Агітатары, якія толькі што вярнуліся з абходу кватэр выбаршчыкаў, дзеляцца сваімі ўражаннямі. Намеснік старшыні ўчастковай камісіі тав. Кузьміноў распытвае іх, дае парады.

— Сёння наш гурток закончыў вывучэнне Палажэння аб выбарах. Апошні раздзел выклікаў такую ажыўленую гутарку, што замест двух гадзін, як звычайна, я прасядзела тры з паловай гадзіны, —расказвае работніца 4-га камбіната агітатар Куклінская.

— А ў нас,—гаворыць другі агітатар тав. Русак, — сёння сапраўды адчувалася, што выбары зусім блізка. Выбаршчыкі засыпалі мяне пытаннямі аб тэхніцы галасавання. Бачыце таго чалавека, які ўвайшоў у перагародку для кабіны? Гэта мой выбаршчык. Ён абавязкова хацеў „паспрабаваць галасаваць".

Каля насценгазеты група агітатараў і выбаршчыкаў абмяркоўвае артыкул аб рабоце ўчастковай камісіі. За сталом трое мужчын чытаюць газету. Яны размаўляюць аб апошніх палітычных падзеях, аб заключэнні мірнага дагавора з Фінляндыяй.

У наступным пакоі 25 выбаршчыкаў з Цёмнай вуліцы ўважліва слухаюць расказ агітатара тав. Судакіна аб камандуючым Беларускай Асобай Ваеннай Акругай тав. Кавалёве, аб яго ролі ў грамадзянскай вайне і пры вызваленні народаў Заходняй Беларусі. Новыя выбаршчыкі заходзяць у пакой і далучаюцца да слухачоў.

9 гадзін вечара. Участак запоўнен народам. Звыш 50 агітатараў, выбаршчыкаў, членаў камісій, гасцей ажыўлена гутараць. Адчуваецца набліжэнне вялікага свята. Няма сумнення, што 24 сакавіка ўсе выбаршчыкі 76 участка 354 выбарчай акругі прыдуць, як адзін, да выбарчых урнаў і аддадуць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Л. Лірская.

МАСКОЎСКІ АЎТАГІГАНТ

Нядаўна споўнілася 15 год савецкага аўтамабілебудаўніцтва. Сваімі поспехамі гэта галіна сацыялістычнай прамысловасці ў значнай ступені абавязана Маскоўскаму аўтамабільнаму заводу імені Сталіна. Завод імені Сталіна — гэта жывая, яркая ілюстрацыя працоўнага ўздыму, смелай ініцыятывы, творчага размаху, якія праявіў рабочы клас пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў і вялікага Сталіна ў барацьбе за індустрыялізацыю краіны.

Царская Расія не мела аўтамабільнай прамысловасці. Спробы арганізаваць вытворчасць аўтамабіляў рабіліся да рэвалюцыі неаднаразова, але яны канчаліся правалам. У 1915 годзе, калі бушавала імперыялістычная вайна, царскі ўрад рашыў пабудаваць аўтазавод. За гэту справу ўзяліся капіталісты Рабушынскія. Атрымаўшы многамільённую субсідыю ад ваеннага міністэрства, яны пабудавалі ў Маскве, у Цюфелевым гаі маламоцны, з прымітыўнымі майстэрнямі завод «АМО», які аказаўся прыгодным толькі для зборкі імпартных машын.

Ужо на другім годзе сацыялістычнай рэвалюцыі, у 1918 г., на сходзе рабочых «АМО» Ленін заявіў, што недалёка той дзень, калі гэты завод будзе выраблядь тысячы савецкіх машын. І за гэтую справу большэвікі ўзяліся хутка пасля сканчэння грамадзянскай вайны.

1-га лістапада 1924 г. заводам «АМО» была выпушчана першая савецкая машына, а 7 лістапада, у час святочнай дэманстрацыі, праз Красную плошчу праехалі ўжо дзесяць савецкіх грузавых аўтамабіляў «АМО-Ф-15». З кожным годам павялічваўся выпуск аўтамашын.

Аднак, завод «АМО» не мог задаволіць патрэбы краіны ў аўтамабілях. Выпускаліся сотні машын, а патрэбны былі тысячы, дзесяткі тысяч.

Партыя большэвікоў, Совецкі ўрад паставілі задачу — стварыць магутную аўтамабільную прамысловасць. Пачалася генеральная рэканструкцыя завода «АМО». Яна закончылася ў кастрычніку 1931 г. На месцы поўрамесніцкіх майстэрань выраслі вялізныя, светлыя, прасторныя корпусы, аснашчоныя навейшай тэхнікай. Новаму заводу было прысвоена імя Сталіна.

У гор. Горкім вырас другі аўтазавод імені Молатава (ГАЗ). Узніклі аўтазавод у Яраслаўлі, другі аўтазавод у Маскве («КІМ»), дзесяткі прадпрыемстваў, снабжаючых аўтамабільную прамысловасць апаратурай, дэталямі. І ўсё-ж вытворчасць аўтамабіляў адставала ад растучага з кожным днём попыту на іх. У 1934 годзе пачалася другая рэканструкцыя завода імені Сталіна, пасля якой ён павінен быў давесці выпуск прадукцыі да 70 тысяч грузавых і 10 тысяч легкавых аўтамабіляў у год.

Завод зараз нельга пазнаць. Усё новае, чым багата тэхніка аўтамабілебудаўніцтва Амерыкі і Еўропы, асвоена аўтазаводцамі. На заводзе можна бачыць тратуар, які сам рухаецца — рабочаму не трэба хадзіць за збіраемай машынай. Гайкі, балты закручваюцца электрычнымі інструментамі, працуюць электрапад'ёмнікі і іншыя механізмы, аблягчаючыя працу рабочага, паскараючыя працэс вытворчасці. Завод ужо даў краіне звыш 300 тысяч грузавых машын.

Аўтазаводцы рыхтуюцца да выпуску машын новых марак. Імі зроблены вопытныя абразцы прыгожага легкавога аўтамабіля тыпу фаэтон, грузавіка, разлічанага на перавозку 5 тон грузу і інш.

Завод стаў школай для работнікаў іншых прадпрыемстваў. Тут яны знаёмяцца з перадавой тэхналогіяй, з навейшымі дасягненнямі канструктарскай мыслі, з вопытам стаханаўскай работы.

На заводзе 180 стаханаўскіх калектываў, пяць цэхаў, заваяваўшых пераходныя чырвоныя сцягі.

Вялікая работа праводзіцца па выхаванню майстроў высокай вытворчасці, многастаночнікаў, рацыяналізатараў, вынаходнікаў, па падняццю кваліфікацыі рабочых, узбраенню іх тэхнічнымі ведамі, павышэнню іх культурнага ўзроўню.

У стаханаўскіх школах перадавікі вытворчасці перадаюць свой вопыт адстаючым. Такіх школ на заводзе 258. З кожным днём шырыцца рух многастаночнікаў.

На заводзе многа вынаходнікаў і рацыяналізатараў. За апошнія пяць год рэалізавана 34.722 каштоўныя прапановы, якія далі больш 37 мільёнаў рублёў эканоміі.

За годы сталінскіх пяцігодак праз заводскую вучэбную сець—курсы, школы, ФЗУ, рабфак, аўтамеханічны тэхнікум, інстытут павышэння кваліфікацыі — прайшло больш 30 тыс. чалавек. Звыш 2 тыс. чалавек накіраваны ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Цудоўным з'яўляецца Палац культуры аўтазавода. У гэтым грандыёзным клубе арганізаваны розныя калектывы: па вывучэнню тэорыі марксізма-ленінізма, гісторыі партыі, літаратуры, драматычны, музыкальны і інш. Тут наладжваюцца лекцыі, канцэрты, выстаўкі. Дзесяткі тысяч рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў аўтазавода і суседніх заводаў знаходзяць у Палацы культуры радасны, цікавы адпачынак, дапамогу ў папаўненні сваіх ведаў. Заводская бібліятэка мае 90 тысяч кніг і 20 тысяч чытачоў. Выдаюцца штодзённая многатыражная газета і дзесяткі насценных газет.

Шмат увагі аддаецца абслугоўванню бытавых патрэб рабочых і спецыялістаў. Бясплатную медыцынскую дапамогу аказвае добра абсталяваны медыцынскі камбінат. 140 урачоў і 142 сярэдніх медыцынскіх работнікі працуюць у гэтым камбінаце. 6 ясляў і 7 дзіцячых садоў выхоўваюць 2.254 дзяцей рабочых і служачых. Ёсць 10 сталовых і 40 буфетаў.

Усё на гэтым аўтагіганце падпарадкавана таму, каб зрабіць працу рабочага творчай, прыемнай, каб выхаваць совецкіх патрыётаў, наватараў вытворчасці, смелых і энергічных барацьбітоў за справу партыі Леніна—Сталіна.

Чорнарабочыя, кавалі, слесары, наладчыкі сталі інжынерамі, тэхнікамі, начальнікамі цэхаў, кіраўнікамі партыйных і профсаюзных арганізацый, дзяржаўнымі дзеячамі.

Гордасць аўтазаводцаў — старшы майстар механа-зборачнага цэха Зінаіда Фёдарава. Яна — дэпутат Вярхоўнага Совета РСФСР. Пачала працаваць наладчыцай, затым скончыла школу фабрычна-заводскага вучнёўства. Тав. Фёдарава — выдатны арганізатар вытворчасці, сапраўдны важак стаханаўцаў.

А. Ф. Багачоў прышоў на завод чорнарабочым. Тут ён пачаў вучыцца, уступіў у партыю, стаў кіраваць цэхам, а потым яго выбралі старшынёй заводскага камітэта.


Начальнік буйнейшага цэха — кузні, інжынер тав. Шварцбург — у мінулым электрамонцёр, начальнік механа-зборачнага цэха № 2 тав. Серпуховіцын працаваў за такарным станком, а потым стаў інжынерам.

Застрэльшчык стаханаўскага руху на аўтазаводзе, каваль В. Бабкоў вучыцца ў Промакадэміі імені Л. М. Кагановіча. У Промакадэміі вучацца таксама былы чорнарабочы орданосец І. Старшынаў, слесар К. Цімафееў і інш.

Маскоўскі аўтазавод жыве многавобразным, кіпучым жыццём. Дзень і ноч тут дбае мысль, кіпіць работа, вядзецца барацьба за выкананне заданняў партыі і ўрада.

Такое жыццё, такая работа магчымы толькі на сацыялістычным прадпрыемстве.

А. МАЦВЕЕЎ.



На здымку: легкавая машына выпуску 1940-га года маскоўскага аўтазавода імені Сталіна. (Фота-клішэ ТАСС).

перад імі, клянуцца ў вернасці, даюць кучу абяцанняў. Выходзіць, што залежнасць дэпутатаў ад выбаршчыкаў поўная. Як толькі выбары адбыліся і кандыдаты ператварыліся ў дэпутатаў — адносіны мяняюцца ў корані. Замест залежнасці дэпутатаў ад выбаршчыкаў, атрымліваецца поўная іх незалежнасць. На працягу 4-х ці 5-ці год, г. зн. аж да новых выбараў, дэпутат адчувае сябе зусім свабодным, незалежным ад народа, ад сваіх выбаршчыкаў. Ён можа перайсці з аднаго лагера ў другі, ён можа звярнуць з правільнай дарогі на няправільную, ён можа нават заблытацца ў некаторых махінацыях не зусім патрэбнага характару, ён можа куляцца, як яму захочацца, — ён незалежны».

Іншая справа ў нас, у соцыялістычным грамадстве.

Па Канстытуцыі СССР, кожны дэпутат абавязан рабіць справаздачу перад сваімі выбаршчыкамі ў сваёй рабоце і ў рабоце таго Совета, куды ён выбран. Калі дэпутат не апраўдвае давер'я выбаршчыкаў, работае дрэнна, ён можа быць у любы момант адклікан па рашэнню выбаршчыкаў ва ўстаноўленым законам парадку.

ШТО ТАКОЕ ТАЙНАЕ ГАЛАСАВАННЕ?

Тайныя ці закрытыя выбары — гэта такі спосаб галасавання, пры якім выбаршчык запаўняе выбарчы бюлетэнь у адсутнасці другіх выбаршчыкаў ці пабочных асоб.

Выбары ва ўсе Советы дэпутатаў працоўных, у тым ліку і ў Вярхоўны Совет СССР, Вярхоўныя Советы Украінскай, Беларускай і другіх рэспублік, праводзяцца тайным галасаваннем.

Таварыш Сталін гаворыць, што тайнае галасаванне дае совецкім людзям «поўную свабоду галасаваць за тых, каго яны хочуць выбраць, каму яны давяраюць забеспячэнне сваіх інтарэсаў». Весь для чаго ўводзена закрытае, тайнае галасаванне.

Совецкія выбарчыя законы — «Палажэнні аб выбарах» — прадугледжваюць правілы, захаванне якіх цалкам забяспечвае тайнае галасаванне на выбарах. На выбарчых участках пры галасаванні выдзяляецца асобны пакой ці наладжваюць кабіны для выбаршчыкаў, запаўняючых бюлетэні. Выбаршчык асабіста апускае бюлетэнь у выбарчую скрынку.

Увесь парадак галасавання, устаноўлены «Палажэннямі аб выбарах», не дапускае якога-небудзь парушэння тайны пры выбарах.

ТЭЛЕГРАМЫ

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

Аб ратыфікацыі Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР мірнага дагавора паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй

19 сакавіка г. г. Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР ратыфікаваў Мірны Дагавор паміж Совецкім Саюзам і Фінляндскай Рэспублікай, заключаны ў Маскве 12 сакавіка 1940 года.

ПРЫБЫЦЦЁ ФІНЛЯНДСКІХ ПРАДСТАЎНІКОЎ п. ПААСІКІВІ, п. ВОЙОНМАА ў МАСКВУ

19 сакавіка прыбылі ў Маскву п. Паасівіі і п. Войонмаа, Упаўнаважаныя Прэзідэнтам Фінляндыі для абмену ратыфікацыйнымі актамі Мірнага Дагавора, заключанага паміж СССР і Фінляндыяй.

На Цэнтральным аэрапорце прыбыўшыя былі сустрэты заг. Пратакольным Аддзелам НКЗС тав. В. Н. Барковым, заг. Аддзелам Прыбалтыйскіх краін тав. А. К. Лысяк, ваенным аташэ шведскай місіі п. Флодстэрм.

ПАСЛЯ ЗАКЛЮЧЭННЯ СОВЕЦКА-ФІНЛЯНДСКАГА МІРНАГА ДАГАВОРА

БАЛГАРСКІ ДРУК АБ МІРНЫМ ДАГАВОРЫ ПАМІЖ СССР І ФІНЛЯНДЫЯЙ

Сафія, 19 сакавіка. (ТАСС). Балгарскі друк працягвае шырока адзначаць мірны дагавор, заключаны паміж СССР і Фінляндыяй. Газета «Народная барацьба» піша: «Мір на поўначы ўстаноўлен да агульнай радасці народаў усіх краін, не жадаючых вайны і вітаючых мір».

Газета «Барацьба» піша: «Нельга не прызнаць вялікага благародства Совецкай Расіі. Напярэдадні поўнай і канчатковай перамогі Расія згадзілася на перагаворы аб міры. Маючы магчымасць праз некалькі дзён прадыктаваць любыя ўмовы, яна не стала на шлях знішчэння малой дзяржавы».

КУБІНСКАЯ ГАЗЕТА АБ СОВЕЦКА-ФІНЛЯНДСКІМ МІРНЫМ ДАГАВОРЫ

Нью - Йорк, 19 сакавіка. (ТАСС). Прагрэсіўная кубінская газета «Нацыіас дэ ой», якая выдаецца ў Гаване (Куба), піша, што Чырвоная Армія сваёй перамогай над Фінляндыяй разбіла планы імперыялістаў і забяспечыла безапасасць Ленінграда. Газета адзначае, што совецка-фінляндскі мірны дагавор умацаваў нейтралітэт скандынаўскіх краін. Гэта перамога, піша газета, з'яўляецца таксама перамогай працоўных усяго свету над падпальшчыкамі вайны.

ВІТАЮЦЬ СОВЕЦКА-ФІНЛЯНДСКІ МІРНЫ ДАГАВОР

Лондан, 19 сакавіка. (ТАСС). Старшыня аўстралійскага саюза гарнякоў Нельсон заявіў сіднейскаму карэспандэнту газеты «Дэйлі уоркер», што совецка-фінляндскі мірны дагавор забяспечыў Совецкаму Саюзу цвёрдыя пазіцыі супроць усіх імперыялістычных пасягацельстваў.

Сакратар аўстралійскага саюза чыгуначнікаў Чэпл заявіў, што мірны дагавор умацаваў Совецкі Саюз у ваенных і дыпламатычных адносінах.

Сакратар аўстралійскага саюза рабочых жалезапрацоўчай прамысловасці Тартон заявіў, што Совецкі Саюз яшчэ раз прадэманстраваў перад усім светам сваю мірную палітыку і паказаў, што ён не імкнецца да парушэння незалежнасці малых краін.

Сустрэча Гітлера з Мусаліні

Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што 18 сакавіка раніцою ў Брэнеры (на германа - італьянскай граніцы) адбылася сустрэча Гітлера і Рыбентропа з Мусаліні і Чыано.

У салон - вагоне Мусаліні адбылася сяброўская гутарка, якая прадаўжалася звыш 2 гадзін.

Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне свайго рымскага карэспандэнта, у якім гаворыцца, што 18 сакавіка ў 13 гадзін Гітлер выехаў з Брэнера ў Берлін. Праз 15 мінут выехаў у Рым Мусаліні.

(ТАСС)

ВАЙНА НА МОРЫ

Нью-Йорк, 19 сакавіка. (ТАСС). З пачатку вайны ў Еўропе ваюючыя краіны затрымалі 128 амерыканскіх параходаў, з іх 108 затрыманы англійскімі ўладамі, 16 — французскімі і 4 германскімі.

Па паведамленню Асошыэйтэд Прэс, англічане намераны выкарыстаць вялікія трансатлантычныя параходы «Куін-Мэры» «Маўрытанія», якія знаходзяцца ў Нью-Йоркскім парту, для перавозкі войск з Аўстраліі.

Токіо, 19 сакавіка. (ТАСС). Англійскія ўлады Сінгапура затрымалі японскі параход «Фусімі-мару», які ішоў у Еўропу, і канфіскавалі пошту.

Лондан, 19 сакавіка. (ТАСС). Французскі параход «Капітан Аўгусцін» вадазмяшчэннем у 3.137 тон наткнуўся на міну і затануў каля ўсходняга пабярэжжа Англіі. Двое з каманды забіты, астатнія выратаваны.

Лондан, 18 сакавіка. (ТАСС). Больш месяца няма звестак аб Англійскім параходзе «Тайбертон» вадазмяшчэннем у 5225 тон. Мяркуюць, што ён загінуў з усёй камандай.

Брусель, 18 сакавіка. (ТАСС) З пачатку вайны страты марскога флота Галандыі складаюць 15 процантаў страт нейтральных краін. Усяго Галандыя згубіла 21 судно вадазмяшчэннем больш 95 тысяч тон.

ВАЙНА ў КІТАІ

Гераічнае супраціўленне кітайскага народа, якое прадаўжаецца звыш двух з паловай год, не толькі расстроіла першапачатковыя планы японскага камандавання, але і прывяло эканоміку Японіі да вельмі цяжкога становішча. З гэтай прычыны частка японскіх палітычных і дзелавых кругоў, баючыся, што далейшае зацягванне вайны прывядзе да эканамічнага краху і соцыяльнага выбуху ўнутры краіны, паставіла на парламенцкай сесіі пытанне аб хутчэйшым спыненні вайны, не адмаўляючыся, відома, ад захопленых тэрыторый Кітая. Аднак, гэты пункт гледжання сустрэў моцнае супраціўленне з боку ўрада і ваенных кругоў, якія імкнуцца да падняволення ўсяго Кітая.

У якім становішчы знаходзяцца зараз японскія войскі ў Кітаі? Перш за ўсё трэба адзначыць, што за апошні час японскія войскі не змаглі дабіцца больш або менш сур'ёзнага поспеху ні на адным участку фронта. Як вядома, у Паўночным Кітаі японская войскі яшчэ ў пачатку лютага пачалі наступленне ў правінцыі Суйюань, на захад ад Баотоу. Гэтае наступленне пацярпела крах. Кітайскія войскі адбілі ў японцаў захопленыя імі ў пачатку наступлення горад Лінхэ і акружылі горад Уюань. Поспехам кітайцаў спрыяла тое, што ім удалося перарэзаць японскія шляхі зносін паміж Баотоу і Уюанем і перашкодзіць японцам падкідаць падмацаванні к лініі фронта.

У Цэнтральным Кітаі найбольш актыўныя аперацыі адбываліся на поўначы правінцыі Чжэцзян. У сярэдзіне лютага японцы занялі ў гэтым раёне рад кітайскіх пунктаў. Перайшоўшы ў контрнаступленне кітайскія войскі вярнулі назад усе страчаныя пункты, за выключэннем Сяошаня, у ваколіцах якога адбываюцца ўпорныя баі. Не дапамагла японцам і высадка дэсанта ў гэтым раёне. Дэсант не здолеў разгарнуць аперацый і аказаць дапамогу асноўным японскім часцям.

Самым ажыўленым аказаўся фронт Паўднёвага Кітая. У канцы студзеня тут японскія войскі разгарнулі наступленне ад Наньніна (поўдзень правінцыі Гуансі) на поўнач—к Уміну і на паўночны ўсход к Біньяну. Ім удалося захапіць абодва гэтыя пункты, але неўзабаве японцы былі выбіты з гэтых гарадоў і адцеснены к Наньніну. У гэтых баях японскія страты складаюць каля 20.000 чалавек, прычым быў знішчан цалкам адзін з японскіх палкоў. Зараз баі адбываюцца блізь Наньніна.

Пацярпеўшы няўдачу ў баях на поўнач ад Наньніна, японцы прабавалі наступаць на паўднёвы захад ад горада — на Фуань (у 40 кіламетрах на паўднёвы захад ад Наньніна), але былі разбіты і адкінуты к Датану.

Як відаць, жадаючы аблягчыць становішча сваіх войск у наньнінскім сектары, японцы высадзілі ў Паўднёвым Кітаі некалькі дэсантаў, спадзеючыся адцягнуць увагу кітайскага камандавання ад асноўнага ўчастка баёў на поўдні.

18 лютага двухтысячны японскі дэсант быў высаджан на поўнач ад Сватоу. Але і тут японцаў пасцігла няўдача: 1800 прыбыўшых салдат, захапіўшы 1500 вінтовак і 20 кулямётаў, перайшлі на старану кітайскіх войск.

Тое-ж здарылася з дэсантам, высаджаным 1 сакавіка на поўдзень ад Амоя (правінцыя Фуцзянь).

(ТАСС).



На здымку (справа налева): слухачы курсаў-работнікаў гарздрава Б. А. Тыкоцынская, сваваўшык фабрыкі № 29 С. О. Фехнер, рабочы фанернага завода А. К. Казберук і ткач фабрыкі № 13 Ш. Ш. Паразоўскі

Фото-Кліше ТАСС.

ПА БЕЛАСТОКУ І ОБЛАСЦІ

«НА ВЫЗВАЛЕНАЙ ЗЯМЛІ»

> Па зямлі па гэтай я ступаю
> Як свабодны, дбайны гаспадар.
> Гэта ўсё — ад краю і да краю—
> Сталіна вялікасная дар.

Такімі радкамі верша «Мой кандыдат» П. Глебкі пачынаецца літаратурны зборнік «На вызваленай зямлі», падрыхтаваным Оргбюро пісьменнікаў г. Беластока. Зборнік прысвячаецца выбарам у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Асноўная тэматыка вершаў, надрукаваных у зборніку, гэта — вобраз Сталіна, гераічная Чырвоная Армія, радасць вызваленага народа.

У зборнік увайшлі вершы і расказы паэтаў 4 нацыянальнасцей: рускіх, беларускіх, яўрэйскіх і польскіх. Пераважную большасць твораў, змешчаных у зборніку, друкуецца ўпершыню. Творы напісаны аўтарамі г. Беластока і пісьменнікамі Масквы, Мінска, якія зараз прымаюць актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі.

Кніга заканчваецца вершам маладога беларускага паэта П. Панчанкі «Песня»:

> Сталін-бацька родны
> Хлеба даў галодным,
> Расчыніў нам насцеж
> Вароты да шчасця.

Кніга гэтая паступіла ўчора у продаж. Яна акажа вялікую ўслугу агітатарам у выбарчай кампаніі.

ШАХМАТНЫ ТУРНІР ШКОЛЬНІКАЎ

Беластоцкі гарадскі камітэт фізкультуры і спорту ў час вясенніх канікул намецiў правесці шахматны турнір школьнікаў на першынство горада. Турнір будзе праводзіцца ў шахматным клубе. Пераможцы атрымаюць граматы гаркома фізкультуры і спорту.

БУДАЎНІЦТВА НОВАЙ ФАБРЫКІ

У м. Высокі Сточак, недалёка ад Беластока, знаходзіцца будынак старой тэкстыльнай фабрыкі, з якой яшчэ некалькі год таму назад вывезены ўсе машыны і абсталяванне.

На працягу 1940 года гэты будынак будзе перабудаваны і ў ім будзе абсталявана новая прадзільная бавоўняна - папяровая фабрыка на 11.500 верацён. Беластоцкім тэкстыльным трэстам складзен праект фабрыкі. На месца работ пачаўся завоз будматэрыялаў.

Машыны для гэтай фабрыкі будуць прысланы з Масквы, Ленінграда і Кіева. Іх падрыхтавалі для адгрузкі.

Каштарысная абсталявання новай фабрыкі складае 5 мільёнаў рублёў. У канцы 1940 года новая фабрыка будзе здана ў эксплуатацыю.

КУРСЫ СОВЕЦКАГА АКТЫВА

21 сакавіка ў мястэчку Заблудава заканчваюць сваю работу курсы нізавога совецкага актыва, на якіх займаецца 40 чалавек. Сярод курсантаў 5 жанчын. Слухачы курсаў паспяхова вывучаюць Канстытуцыю СССР і БССР, гісторыю большэвіцкай партыі, асноўныя рашэнні партыі і ўрада па пытаннях сельскай гаспадаркі. Яны вывучаюць таксама статут сельгаспадарчай арцелі, агратэхніку, пытанні міжнародныя.

ВЫЕЗД ВАЛЕЙБАЛІСТАЎ

20 сакавіка ў Брэсце пачынаюцца спаборніцтвы на першынства БССР па валейболу.

19 сакавіка з Беластока выехалі 2 каманды валейбалістаў (мужчынская і жаночая) для ўдзелу ў гэтых спаборніцтвах.

ПІСЬМО ў РЭДАКЦЫЮ

Паважаны таварыш рэдактар! Дазвольце праз Вашу газету выказаць падзяку дырэкцыям і рабочым друкарні „Беластокер штэрн" і першай дзяржаўнай друкарні гор. Беластока тт. Рубіну, Давыдаву, Казаку, Рэйтэру, Каплану, Фінкельштэйну, Длугачу, Фрыдману, Бернацкаму, Хацкелю, Кельману і Шыфрыну, якія сваёй старанай работай забяспечылі ў кароткі тэрмін выхад з друку літаратурнага зборніка „На вызваленай зямлі", прысвечанага выбарам у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Па даручэнню рэдакцыі зборніка

Пятро Глебка,
Павел Герман.

Гор. Беласток,
19 сакавіка 1940 г.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 22 (па камутатару аблвыканкома) і 49 (гарадскі), сакратарыята, партыйнага і совецкага аддзелаў — 23 (па камутатару аблвыканкома), прамысловага, сельскагаспадарчага, культурнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17-62 (гарадскі). Тэлефон выдавецтва і аддзела аб'яў — 16-10. Тэлефон друкарні і начной рэдакцыі — 5-21.
Падпіску на газеты прымае «Саюздрук» (Тэлефон 5-14).

Упаўнаважаны абліта № 399. 1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку